**Міжыгурская-Бунто Т.**

# НІНА ПЯТРОВА: "СТУЖКА" – ЖЫЦЦЁ МАЁ"

*У дзяцінстве Ніна марыла вывучыцца на ўрача, каб вылечыць хворую маму. "Марыла быць урачыхай, а стала ткачыхай!" – смяецца Ніна Рыгораўна Пятрова, дырэктар ААТ "Стужка". Так, той самай знакамітай "Стужкі", без прадукцыі якой, бадай, не абыходзіцца ніводны дом, ніводная беларуская сям'я.*

Калі мы гаворым "Ленточка" (а менавіта так ласкава называюць гэта прадпрыемства ў народзе), то нам адразу ўяўляецца штосьці лёгкае, рамантычнае: атласныя банцікі, ажурныя сурвэткі, далікатныя фіранкі... Між тым за гэтай лёгкасцю – сур'ёзная праца вялікага калектыву.

Працоўная біяграфія "Стужкі" налічвае сорак гадоў. І ва ўсе часы гэта прадпрыемства было (і ёсць) у ліку перадавых. Фабрыцы належыць своеасаблівы рэкорд: 80 кварталаў запар "Стужка" станавілася пераможцай ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве. На працягу ўсёй сваёй гісторыі фабрыка толькі павялічвала аб'ём выпуску прадукцыі і нарошчвала вытворчую магутнасць. Так, у мінулым годзе рост вытворчасці на "Стужцы" ў параўнанні з 1990-м склаў 390%! А колькасць працаўнікоў за названы перыяд павялічылася з 1100 да 1500 чалавек (і гэта ў той час, калі многія прадпрыемствы скарачаюць свой штат). Цэхі працуюць у 3-4 змены. І ўсё, што ствараецца ў гэтых цэхах: фіранкі, абрусы, сурвэткі, ламбрэкены дэкаратыўныя, атласныя стужкі, шнуры, – атрымлівае высокую адзнаку пакупнікоў і ў Беларусі, і за мяжой. Нездарма тры гады запар калектыў трымае першынство і ў гарадскім спаборніцтве, і сярод прадпрыемстваў канцэрна "Беллегпром". Гардзіннае палатно ААТ "Стужка" ў мінулым годзе аказалася па-за канкурэнцыяй у аглядзе-конкурсе "Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі" і ўвайшло ў каталог "100 лепшых тавараў Расіі". Вядома, да поспехаў "Стужкі" самае прамое дачыненне мае яе дырэктар, Ніна Рыгораўна Пятрова. Усе разумеюць, што прадпрыемства выстаяла ў цяжкі час і працвітае сёння ў многім дзякуючы моцнаму характару гэтай жанчыны.

Для Ніны Рыгораўны "Стужка" стала жыццём у прамым сэнсе слова.

Працоўная біяграфія дырэктара – гэта і працоўная біяграфія прадпрыемства. Ніна Рыгораўна прыйшла на стужкаткацкую фабрыку, калі толькі-толькі запускалі першыя ткацкія станкі. На якой бы пасадзе ні працавала – не адчувала сябе нязначнай працоўнай адзінкай. Наадварот, ёй заўсёды здавалася, што тая праца, якую яна выконвае, самая важная для вытворчасці.

Была ткачыхай – уяўляла, што менавіта ткачыхі самыя галоўныя людзі на фабрыцы; потым пачала працаваць інструктарам вытворчага навучання – думала, куды ім без маіх інструкцый і парад; прызначылі інжынерам-

нарміроўшчыкам – здавалася, што менавіта ад таго, як яна ацэніць працу людзей, будзе залежаць іх лёс; потым дзесяць гадоў працавала галоўным інжынерам – зразумела: усё залежыць ад тэхналагічнага працэсу. Такое ўспрыманне сваёй ролі ў калектыве можа быць толькі ў чалавека неабыякавага, улюблёнага ў сваю працу.

Працоўны дзень Ніны Рыгораўны пачынаецца ў восем раніцы і заканчваецца ў восем гадзін вечара. І ўсё па зладжаным графіку – без зрываў і спазненняў. Звычайна, ужо едучы на працу, яна абавязкова пазвоніць на прадпрыемства: як пачаўся дзень, якія навіны?.. Дарэчы, дэталь, якая яскрава характарызуе Пятрову як кіраўніка: у яе прыёмнай з васьмі да дваццаці гадзін заўсёды (нават у час абедзеннага перапынку) адказвае тэлефон. Ніне Рыгораўне бывае дзіўна (часам падобнае нават абурае), калі ёй трэба звязацца з кім-небудзь па справах, а рабочы тэлефон у чалавека не адказвае. Адразу ўзнікае думка: а які ты працаўнік і ці трэба наогул з табою мець справы?

Яна прадпрыемства ведае дасканала.

Усе прыступкі прайшла, як кажуць, кожны вузельчык памацала сваімі рукамі. Таму добра ўяўляе і вытворчасць, і ўмовы працы, і праблемы работнікаў. А большасць іх – 1200 чалавек з паўтары тысячы – жанчыны. Вось і атрымліваецца, што гіганцкія аб’ёмы вытворчасці асвойваюцца працавітымі жаночымі рукамі. Хоць прамысловасць і называецца лёгкай, але праца гэта цяжкая. У ткачых загружанасць працоўнага дня – 97%.

У кожнай ткачыхі – 4-6 станкоў. Адзін яна абслугоўвае, пяць працуюць.

Не адыдзешся, не забавішся пустой размовай з сяброўкай. І, вядома, ля станкоў на крэсле не прысядзіш. Да таго ж – вытворчы шум, у ткацкіх цэхах той дасягае 85 дэцыбелаў.

У вязальшчыц, снавальшчыц, фарбавальшчыц, пляцельшчыц свае асаблівасці працы і свае праблемы. Нялёгка ўсё ж такі даюцца лёгкасць і прыгажосць узорыстых фіранак!..

Ніна Рыгораўна ведае ўсё гэта, таму як кіраўнік робіць усё для стварэння падначаленым добрых умоў працы, адпачынку і быту. На прадпрыемстве працуюць стаматалагічны, масажны кабінеты. Жанчынам, якія выхоўваюць двух і больш дзяцей, дадаткова даюцца дні адпачынку. На тэрыторыі фабрыкі працуюць бібліятэка, цырульня, буфет, дзе можна набыць прадукты для сям'і. На "Стужцы", як і ў былыя часы, добрая мастацкая самадзейнасць, праводзяцца святочныя вечары, "агеньчыкі", конкурсы; працуюць турыстычныя і сгіартыўныя секцыі. Як сапраўдная гаспадыня, Ніна Рыгораўна захавала лепшыя традыцыі і набыткі мінулых гадоў – адзінства духу калектыву "Стужкі".

Хоць быў цяжкі перыяд на пачатку дзевяностых гадоў, калі рынак захліснуў вал няякаснай, затое таннай прадукцыі з блізкага і далёкага замежжа, а таксама розных дамарошчаных фірм і фірмачак "гаражнай вытворчасці", "Стужка" не згубіла сваёй маркі, утрымала спецыялістаў, зрабіла стаўку на стварэнне канкурэнтаздольнай прадукцыі і павялічыла вытворчую магутнасць у два разы. Выжыць, выстаяць, вытрымаць і перамагчы здолелі перш за ўсё

дзякуючы дзелавой хватцы і мудрасці кіраўніка. "Вырабіць – гэта яшчэ паўсправы, – гаварыла Ніна Рыгораўна. – Галоўнае – выгадна прадаць. Трэба добра ўяўляць тых пакупнікоў, для якіх мы працуем, і арыентавацца на іх"... Бралася ў разлік усё: якасная сыравіна, найсучаснае абсталяванне, модны дызайн, прыгожая ўпакоўка, даступная цана... Поспеху спрыяла адкрыццё і расшырэнне сеткі фірменных магазінаў і секцый. Сёння ўжо гандлёвыя кропкі "Стужкі" ёсць не толькі ў Магілёве і Мінску, але і ў Гомелі, Брэсце, Гродне, Мазыры, Маскве і Санкт-Пецярбургу. Прадукцыю прадпрыемства ахвотна купляюць у Расіі, Украіне, Малдове, краінах Балтыі, Чэхіі, Польшчы, Італіі. І вядома – у Беларусі.

Асоба Ніны Рыгораўны Гіятровай прыцягнула ўвагу французскай Асацыяцыі садзейнічання прамысловасці, заснаванай яшчэ ў 1801 годзе. Гэта аўтарытэтная арганізацыя ў 2000 годзе адзначыла поспехі калектыву ААТ "Стужка" залатым медалём "За дынамічнае развіццё і рэалізацыю новых праектаў", а Ніна Рыгораўна была ўдастоена нагруднага знака "За заслугі ў стратэгічным кіраванні прадпрыемствам".

Акрамя таго, Ніна Гіятрова была названа "Чалавекам года-2001" Магілёўскай вобласці. А ў 2002 годзе ААТ "Стужка" атрымала міжнародную ўзнагароду "Еўрапейскі знак якасці" ў намінацыях "Прадпрыемства XXI стагоддзя" і "Кіраўнік XXI стагоддзя".

"Стужцы" і яе кіраўніку спрыяе заслужаны поспех... А да таго ж трэба зазначыць, што і сям'ю Ніна Рыгораўна стварыла моцную, дзяцей выхавала добрых...

***Міжыгурская-Бунто, Т. Ніна Пятрова: "Стужка" — жыццё маё..." : [пра дырэктара ААТ "Стужка"] / Т. Міжыгурская-Бунто // Алеся. — 2003. — № 8. — С. 6—7.***